ЗОК / 1844

Работніца і калгасніца Беларусі 1933

№9-11/12-16 ХР.

30K
1844

РАБОЧНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА

БЕЛАРУСІ

„ПАЛІТЫКУ МІРУ БУДЗЕМ ВЕСЬ
І НАДАЛЕЙ УСІМІ СІЛАМІ, УСІМ
СРОДНАМІ. НІ АДНЕЙ ПЯДЗІ Ч
ЖОЙ ЗЯМЛІ НЯ ХОЧАМ, АЛ
І СВАЁЙ ЗЯМЛІ, НІ АДНАГО ВЯ
ШКА СВАЁЙ ЗЯМЛІ НІКОМУ
НЕ АДДАМО" (СТАЛІН).

№ 9
1933.

ЗЬМІТРО ВІТАЛІН

Песьні сястры

Першая песьня сястры

Гарцавалі коньнікі
каля падаконьніка
і гукалі дзеўчыну:
— Дай
вады,
І пыталі дзеўчыну:
— Дзе-ж
малады...

І казала дзеўчына
коньнікам,
Двойчы зачарпаючы
конаўкай:

— Два гады мінулася
і няма чагось...
Ён казаў вярнуся,
мой Тадось.

І пытала дзеўчына:
— Што-ж гэта за сутарма.
І казала дзеўчына:
— Горка мне і мутарна...

Гарцавалі доўга
каля вокан коньнікі.
Тройчы зачарпала
Донька ваду конаўкай...

Тройчы зачарпала,
тройчы пазірала.
І маўчалі нечага
коньнікі ля дзеўчыны..

„Яны нешта ведаюць,
ой ты, мой Тадосю..
Дзе ты, любы, дзе ты?..
Можа, любы, досыць“...

„Ой, Тадось далёка,—
думалася коньнікам,—
ведаем—ня лёгка.
а ня скажам, Донька...“

І галёпам рынулі.
і глынулі даль.
І гарэць пакінулі
нявымоўны жаль.

У блакітных ворліках
панавісла рось:
гарцавалі коньнікі,
А ля іх—Тадось...

Другая песьня сястры

Надыходзіць Балаховіч.
Гэй-жа, гей, буланы.
Наступае Балаховіч
з лютымі уланамі ..

Ужо выразаны Лельчыцы,
і крывёю Прыпяць пеніць.
Што-ж мне порацца ля печы
в чапялою над крупеняй.

Ані бацькі, ані маці,
ні радні ніякае.
Што-ж я высяджу ў хаце.
беднай небаракаю?..

Я ня ведаю, што будзе,
ды ўскульбачан конь мой.
Каб я ведала—ўпаду дзе,
там лягла спакойна-б.

Каб я ведала, што прыдзе
мой Тадось, што будзе..
Дайце птушчыныя скрыдлы,
дарагія людзі.

Я аблётаю краіну
ды з канца ў другі канец.
Ён загінуў?
Не загінуў!
Ён загінуў?
Не і не!

Дык бывай-жа, хата родная.
Паварочвайся, буланы.
Блудзіць ночка непагодная
па балоцістых палянах.

Наши девушки, ремешком
Подпоясывая шинели,
С песней падали под ножем,
На высоких кострах горели.
М. Светлов.

Надыходзіць Балаховіч.
Гэй-жа, гэй, буланы.
Наступае Балаховіч
з лютымі уланамі...

У шынэлі стрэну роднага.
Дык барджэй-жа, мой буланы.
Згінь ты, ночка непагодная.
на балоцістых палянах.

Трэцяя песьня сястры

Мне сьпявала маці так:
— Выйду я ў садочак,
у садочку на пясочку
знайду два сьлядочкі.

Ай, адзін-жа той сьлядочак
каня вараного,
ай, другі-ж-другі сьлядочак
то майго мілога.

Гэй, пайду-ж у садочак —
мне сьпявала з болем...
.. Ня было-ж у нас садочка,
ня было ніколі...

І сьпявала:
— Сонца, сонечка,
на цябе вінюся,
што раненька ўзыходзіш,
што ты позьненька заходзіш.
— Хоць я раненька ўзыйду—
Ты ўжо гнешся віцы.
Хоць і позьненька зайду—
Ты яшчэ на ніўцы...

Так сьпявала мая маці,
і ўздыхала: Дочанька...
... Ні скарыначкі ў хаце,
Падаўна—садочкаў...

За сады, за хлеб румяны,
што ў дзяжы з падходам—
мой Тадось пайшоў на пана
Баявым паходам...

І нямашака—загінуў...
Але дум ня сходзіць:
— за сады і за краіну.
Я іду паходам.

Адыходзіць Балаховіч.
Гэй-жа, гэй, буланы.
Уцякае Балаховіч
з лютымі уланамі.

Шаламіты і страшыдлы
мчацца прочкі вопадзе.
Мы—за імі, мы па выймах —
прападайце пропадам...

Мазыр—Менск
1932 г.

3ок
1844

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Работніца і Калгасьніца Беларусі

ЛЮТЫ 1933 г.
№ 9 (190)

15 гадавіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі

23 лютага 1918 году, камуністычная партыя пад непасрэдным кіраўніцтвам тав. Леніна, паклала пачатак арганізацыі рэгулярнай Чырвонай арміі—непераможнай узброенай сілы пралетарскай рэвалюцыі.

У агні грамадзянскай вайны, грудзьмі абараняючы рэспубліку Саветаў, расла і ўмацоўвалася Чырвоная армія. Пад яе сакрушальнымі ўдарамі былі раэьбіты і выкінуты за нашы межы, як арміі капіталістычных інтэрвэнтаў, так і іх простыя саюзьнікі—рускія генэралы Юдзеніч, Урангель, Дзянікін, Калчак і шмат іншых катаў працоўных мас. Упяршыню ў гісторыі, наша партыя стварыла армію, якая ведае, за што яна змагаецца. Упяршыню ў гісторыі рабочая кляса і працоўнае сялянства ўзялі ў рукі зброю, каб абараніць сваю ўласную зямлю, свае фабрыкі, адабраныя ад капіталістаў і памешчыкаў. Старая царская армія была зброяй імпэрыялістычнай палітыкі фабрыкантаў і памешчыкаў.

Наркомвоенмор Клім Варашылаў

Салдат быў бяспраўным ніжнім чынам, „шэрай скацінкай", як яго называлі афіцэры Салдат разглядаўся як гарматнае мяса. Салдата і за чалавека ня лічылі. Прыпамятайце, ва многіх грамадзкіх мясцох былі наваг такія надпісы—ніжнім чыном і сабакам уваход забаронен. Генэралы вучылі, „стоячы перад салдатам, забывай, што ён чалавек". Царская казарма была самай горшай турмой. Такое бяспраўе салдата выцякала з таго, што гэта была армія чужой нам клясы, армія, якая абараняла буржуазны лад. Прыпамятайце, з якім плачам праводзілі вы сваіх сыноў і братоў у гэту бяспраўную і сушачую розум і сэрца казарму.

Кастрычніцкая рэвалюцыя разбурыла стары буржуазны лад, разбурыла і старую царскую армію. Замест яе была створана Чырвоная армія, клясавая армія пралетарскай дзяржавы. Ленін вучыў нашу партыю, вучыў рабочую клясу, што „прыгнечаная кляса, якая ня імкнецца да таго, каб навучыцца аўладаць зброяй, мець зброю, такая прыгнечаная кляса заслугоўвала толькі таго, каб з ёю абыходзіліся, як з нявольнікамі". (Ленін, том XIX, стар. 326).

Мы не хацелі і ня хочам быць нявольнікамі, мы стварылі магутную Чырвоную армію, мы як вока беражэм нашу Чырвоную армію, умацоўваем яе абароназдольнасьць. І ў гэтым умацаваньні не малая заслуга належыць працоўнай жанчыне—поўнапраўніку будаўніку сацыялізму ў нашай краіне.

15-ю гадавіну Чырвоная армія сьвяткуе ў такі гістарычны момант, калі наша краіна, пад кіраўніцтвам партыі, пераможна завяршыла пяцігодку за чатыры гады. Мы ўступілі ў другую пяцігодку, у якой пабудуем бясклясавае грамадзтва. Магутная цяжкая прамысловасьць, перадавая тэхніка, хэмія, машына-будаўніцтва, самая буйная ў сьвеце калектыўная сельская гаспадарка яшчэ больш ўмацавалі абароназдольнасьць нашай краіны. У выніку пяцігодкі—казаў тав. Сталін на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б)—„Савецкі саюз ператварыўся ў краіну моцную ў сэнсе абароназдольнасьці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасьцяй, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя сродкі абароны і забясьпечыць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку".

Да 15 гадавіны РСЧА зусім не падобна на тое, чым яна была ў 1928 годзе. Сёньня мы маем свой добры ручны кулямёт, танкавы і авіяцыйны кулямёт, свае зэнітныя кулямётныя ўстаноўкі, с мазарадную вінтоўку, некалькі ўзораў аўтаматычнай вінтоўкі, кулямёт-пісталет, аўтаматычны пісталет. Удасканалілі нашу старую артылерыю, склалі свае новыя сыстэмы цяжкай і зэнітнай артылерыі, дробна-калібэрную артылерыю, маем супроцьтанкавыя гарматы, спэцыяльную сыстэму гарматаў для суправаджэньня дробных падразьдзяленьняў. Мы вырабляем сучасныя танкі, якія далёка пайшлі наперад у галіне самалётабудаўніцтва, стварылі авіяцыйную і аўта-трактарную прамысловасьць, маем рад навейшых узораў авіяматораў і г.д. А галоўнае ў тым, што краіна стварыла свае ўласныя кадры канструктараў, вынаходцаў, спэцыялістаў, якія з вялізарнейшым энтузіязмам працуюць у галіне стварэньня абаронатэхнічнай культуры.

Посьпехі ў галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі даюць для арміі высокакаштоўныя людзкія кадры. У армію ідзе рабочы-ўдарнік, які мае вопыт змаганьня за новую сацыялістычную дысцыпліну, выхаваны на рашучым змаганьні з рвачамі, лятунамі, гультаямі і інш. дэзарганізатарамі сацыялістычнай прамысловасьці. У армію ідзе ўдарнік калгасаў і саўгасаў, які мае вопыт непрымірымага змаганьня з кулацтвам, змаганьня за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўра-

ГНБ Ср.-Ак.

джайнасьць. Гэта нязьмерна ўмацоўвае Чырвоную армію. Значна вырасла партыйна-камсамольская арганізацыя РСЧА—з 31,6 проц. у 1928 годзе да 59,4 проц. у 1933 годзе. Вырасла агульная культурнасьць чырвонаармейцаў і начальніцкага складу.

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў, забясьпечыла Чырвоную армію магутнай сучаснай тэхнікай. Чырвоная армія з упартасьцю змагаецца за аўладаньне новай тэхнікі, рыхтуючыся да пераможных баёў за сусьветны камунізм.

„У мэханізаванай вайне, якой мы ня хочам, супроць якой змагаемся, але якую супроць нас рыхтуюць, патрабуюцца кваліфікаваныя мэханікі, тэхнікі, патрабуюцца людзі, гатовыя ня толькі паміраць, але і ўмеючыя правільна абыходзіцца з кожным вінцікам гэтай вельмі грознай, далёка няпрыемнай ваеннай машыны" (Варашылаў).

Такіх людзей дае наша сацыялістычная прамысловасьць і калгасная сельская гаспадарка. У будучай бойцы будуць прымаць удзел ня толькі шматмільённыя арміі, а ўвесь народ, уся краіна. Жанчына, якая працуе на ўсіх вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва, павінна памятаць, што ў небясьпечны час яна павінна стаць ля вяршгату, сесьці на трактар, камбайн, аўтамабіль. Таму больш бальшавіцкай ўпартасьці ў барацьбе за аўладаньне гэтай канкрэтнай тэхнікай. Заўсёды памятай аб ваеннай небясьпецы. У сыстэме нашых грамадзкіх арганізацый (ОКК, Асоавіяхім, Аўтадор) рыхтуйся быць актыўнай ўдзельніцай у абароне першай у сьвеце бацькаўшчыны працоўных.

Камуністычная партыя стварыла Чырвоную армію і арганізавала яе перамогу ў грамадзянскай вайне. Лепшыя людзі нашага часу—**Ленін, Сталін, Фрунзэ і Варашылаў**—былі будаўнікамі нашай арміі, арміі новай клясы, якая прышла да ўлады. У найбольш абвостраны пэрыяд грамадзянскай вайны 60 проц. усёй партыі, гэта значыць каля 300 тысяч камуністаў, змагаліся ў радох Чырвонай арміі, сваім самаадданым змаганьнем, лепшым прыкладам самаахвярнай мужнасьці, вучылі яе перамагаць. 50 тысяч камуністаў загінулі на франтох грамадзянскай вайны, абараняючы справу пралетарскай рэвалюцыі. Чырвоная армія непарыўна зьвязана з працоўнымі масамі нашай краіны. Імя Чырвонай арміі з вялікім замілаваньнем вымаўляецца прыгнечанымі і эксплёатуемымі ўсяго сьвету. Першаклясная палітычная школа—Чырвоная армія дае краіне кожны год сотні тысяч адданых будаўнікоў сацыялізму, энтузіястаў калгаснага будаўніцтва.

Забясьпечана перамога сацыялізму на аднэй шостай частцы зямлі, тады як пяць шостых ахоплена найглыбейшым эканамічным крызісам. Капіталістычная сыстэма, якая аджывае свой век, ня ўступае і ня ўступіць бяз упартага змаганьня сваіх пазыцый. Сусьветная буржуазія будзе прабаваць перамагчы свае труднасьці за кошт СССР.

На Далёкім Усходзе з захватам Манчжурыі—простай падрыхтоўкай да падзелу Кітаю—японскі імпэрыялізм ужо моцна стаў на шлях вайны. Эўропа становіць сабой моцны кіпучы кацёл невырашальных капіталістычных супярэчнасьцяй. Савецкі саюз магутным гранітным уцёсам стаіць на варце міру. „Нашы межы сьвяшчэнны і непарушны"—кажа тав. Варашылаў.

Савецкі саюз вёў і праводзіць далей цьвёрдую палітыку міру. Але калі-ж імпэрыялісты пойдуць на нас вайной, мы будзем біцца з усёй уласьцівай нам палкасьцю 160 мільёнаў свабоднага народу. Мы ведаем, што за нас усё працоўнае чалавецтва, мы ведаем, што мы пераможам". (Варашылаў).

І ў гэтай вялізарнай клясавай барацьбе за канчатковае вызваленьне ўсіх прыгнечаных і эксплёатуемых ад прыгнечаньня, голаду і галечы працоўная жанчына будзе стаяць у першых радох байцоў.

Таварышы работніцы і калгасьніцы, у 15 гадавіну Рабоча Сялянскай Чырвонай арміі яшчэ вышэй тэмпы барацьбы за выкананьне народна гаспадарчага пляну першага году другой пяцігодкі. Шырэй фронт барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўраджайнасьць, за ўдарную калгасную брыгаду, за ўдарную падрыхтоўку да першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі.

Уключайцеся ва ўсебеларускі агляд абаронча-масавай працы ячэек Асоавіяхіму.

Згуртаванымі радамі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, наперад да новых перамог па шляху арганізацыі бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Іваноў.

СССР ператварыўся з краіны адсталай у краіну магутную, перадавую, незалежную

(З дакладу т. Кагановіча на Ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў ударнікаў).

Калі раней, да пяцігодкі, большую частку з неабходных нам прамысловых вырабаў і, асабліва, машыны, сталь, трактары і г. д. прыходзілася ўвозіць з-заграніцы, г. зн. мы былі ў залежнасьці ў гэтай частцы ад заграніцы, то цяпер мы ўжо самі вырабляем свой чыгун і сталь, свае аўтамабілі і трактары, свае складаныя варштаты, здабываем нафту, вугаль, вырабляем хэмічныя прадукты, напрыклад, супэрфасфат, які так нам патрэбен для ўгнаеньняў у сельскай гаспадарцы.

Апрача таго, мы вырабляем зараз і іншыя прадметы, вельмі каштоўныя для нас на выпадак, калі-б на нас напалі чужаземныя капіталісты. Мы вырабляем зараз аэраплявы, танкі, бронямашыны, артылерыю і г. д., **выканаўшы пяцігодку за чатыры гады.** Мы, таварышы, да будзёнаўскай кавалерыі дадалі яшчэ „кавалерыю" тэхнічную, „кавалерыю" лётаючую, поўзаючую, плаваючую і ныраючую, „кавалерыю", якая здолее разьбіць ворага, калі ён адважыцца напасьці на нашу вялікую сацыялістычную краіну. **(Бурныя аплёдысмэнты).**

Калі нашу краіну раней замежныя буржуі лічылі дзікай, калі раней на яе паказвалі пальцамі: вось, моў, існуюць дзьве вялікія краіны—Кітай і Расія і абедзьве яны адсталыя краіны, то сёньня

ўжо аб нашай краіне ня можа быць такой гутаркі. Па сваёй палітычнай пабудове мы, дзяржава рабочых і сялян, з самага свайго ўзьнікненьня былі і ёсьць далёка ўперадзе ўсіх іншых краін, якой-бы дзяржаўнай будовай яны не прыкрываліся. Чаму? Ды таму, што там на чале ўлады стаяць капіталісты і зямляўласьнікі. А ў нас рабоча-сялянская ўлада, сацыялістычны лад. Сёньня-ж наша сацыялістычная краіна стала і па гаспадарцы, і па тэхніцы ў перадавыя рады найбольш разьвітых краін сьвету.

ПОСЬПЕХІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ НАМ МІР

Калі яшчэ ня так даўно многія групы імпэрыялістаў адкрыта выказваліся за напад на нашу краіну, то сёньня самыя злосныя ворагі рабочых і сялян, ворагі, якія жадаюць у крыві патапіць нашу савецкую рэспубліку, вымушаны прыкрываць алейнымі гутаркамі сваю нянавісьць да нас і лічыцца з нашай магутнай сілай. Яны разумеюць, што з намі жартаваць цяпер нельга, бо мы ўжо маем ня толькі простае ўзброеньне, але мы ўзброены таксама новымі тэхнічнымі прыладамі абароны—танкамі і аэраплянамі. І мы можам выраблять усе гэтыя прылады абароны, калі гэта запатрабуецца, і ў вялікай колькасьці. Вайны мы ня хочам, але калі на нас капіталісты выпусьцяць свае аэрапляны, танкі, то мы ўжо не бяззбройныя, мы здолеем на іх аэрапляны выпусьціць свае аэрапляны, на іх танкі—свае танкі, на іх бранявікі мы высунем калёны сваіх сацыялістычных магутных бранявікоў. (Аплёдысмэнты). Таварышы калгасьнікі і рабочыя! Падводзячы вынікі нашых перамог, мы павінны памятаць адно, калі-б мы не пасьпелі ў кароткі тэрмін сапраўды ўзьняць нашу прамысловасьць, мы з вамі сёньня мелі-б ня мірную працу, а мелі-б вайну, інтэрвэнцыю, напад імпэрыялістаў на нас з захаду і ўсходу.

Вы чулі аб нашых далёка-ўсходніх суседзях. І там былі такія групы, групы, а не народ, які стогне пад уціскам капіталістаў, там былі групы імпэрыялістаў, багатыроў, генэралаў, якія хацелі і зараз яшчэ мараць аб нападзе на нас. Што-ж вы думаеце, яны не напалі на нас з-за нашых прыгожых вачэй? Ці не напалі таму, што капіталісты зразумелі, што рускія, украінскія і іншыя рабочыя і сяляне будуюць сваё жыцьцё і ня трэба, моў, ім перашкаджаць? Не, ня гэтага яны хочуць. Яны ахвотна перашкодзілі-б нам, але яны дасканала разумеюць, што калі-б яны напалі на нас, то мы далі-б ім жорсткі адпор, яны зразумелі, што порах у нашых парахоўніцах павялічыўся, што калі яны нападуць на нас, то мы дамо ім здачы. (Аплёдысмэнты).

Пяцігодка забясьпечыла нам мір. Вядома, ня трэба супакойваць сябе. Трэба памятаць, што імпэрыялісты могуць у любы момант напасьці на нас. Гэта трэба цьвёрда памятаць і растлумачыць усім працоўным. Нашы прадстаўнікі, дыплёматы, выступаюць перад усімі народамі, змагаючыся за мір. Калі ёсьць краіна на сьвеце, якая сумленна і шчыра жадае міру, то гэта толькі наша сацыялістычная краіна. Мы,—як гаварыў тав. Сталін,—**„ні аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому“**. Мы будуем сваё новае сьветлае жыцьцё, узяліся за вялікую, сусьветную справу. Мы хочам закончыць гэту справу на карысьць працоўных усіх краін, змагаемся за мір, настойваем на раззбраеньні. Мы прымаем удзел у пасяджэньнях па раззбраеньні з іншымі краінамі. Мы выкрываем там усе хітрыкі, усе махінацыі нашых клясавых ворагаў. Пры гэтым для нас, зразумела, мае значэньне ня толькі выкрыцьцё. Мы заключаем дагавары аб ненападзе. І ўжо заключылі, як ведаеце, такія дагавары аб ненападзе з радам краін, у тым ліку з Польшчай. Японія пакуль што з намі яшчэ ня заключае пакту аб ненападзе, але калі яна хоча міру, то яна да гэтага няўхільна павінна прыйсьці.

Што гэта значыць—пакт аб ненападзе? Гэта значыць, што мы заключаем дагавор: мы на іх нападаць ня будзем, яны на нас нападаць ня будуць. Па-дыплёматычнаму гэта называецца пакт, а па-прасту можна-б сказаць: **ня лезь на нашу зямлю, мы на тваю не палезем; палезеш на нашу—па мордзе дамо.** (Бурныя аплёдысмэнты). Наша партыя выступае застрэльшчыкам у барацьбе за вызваленьне ўсіх прыгнечаных народаў. Мы выступаем у абарону слабых дзяржаў. Капіталізму цяжка адмовіцца ад прыгнятаньня, ад сваёй зьверска-эксплёататарскай прыроды. Найшырэйшым масам, мільёнам працоўных мы паказваем, што ўсе гэтыя марна балбочучыя буржуазныя дыплёматы з лягеру Лігі нацый проста ашукваюць народы. На нашым прыкладзе мы пераконваем мільёны, што толькі ў барацьбе з капіталізмам, толькі тады, калі народы па нашаму прыкладу створаць сваю рабоча-сялянскую рэспубліку, свае саветы,—толькі тады наступіць поўны мір на зямлі.

Наша бальшавіцкая партыя, наш урад умела, разумна, па-ленінску мудра, вядзе сваю цьвёрдую палітыку міру. Бо задача-ж, таварышы, складаная, цяжкая. Вырашыць яе лёгка нельга. Мы акружаны з усіх бакоў капіталістычнымі краінамі. У нас многа ворагаў. Нам трэба краіну—і ня простую краіну, а сацыялістычную—абараніць, трэба яе гонар падтрымаць, гонар нашага вялікага працоўнага народу, які зрабіў пралетарскую рэвалюцыю і ўстанавіў дыктатуру пралетарыяту. Трэба не даваць другім пляваць на нас, але ў той-жа час трэба ўнікаць сутычак, не даваць повяду імпэрыялістам напасьці на нас. Партыя і наш урад гэту мудрую, складаную палітыку вядуць няўхільна, ахоўваючы мір. Нас падтрымліваюць мільёны працоўных усіх краін,—але для таго, каб мір захаваць, нам ня проста трэба гаварыць аб міры. Нельга махаць голымі рукамі, узьнімаць вочы на неба, ці наладжваць „набажэнствы“ аб міры. Гутарка гутаркай, а ўмацоўваць ваенную магутнасьць нашай Чырвонай арміі, гэта баявая задача нашай краіны, **сьвяты абавязак усіх рабочых і калгасьнікаў.** (Працяжныя аплёдысмэнты).

За апошнія гады,—а хутка мы будзем сьвяткаваць 15-годзьдзе Чырвонай арміі,—мы дабіліся вялікіх посьпехаў у справе ўмацаваньня яе магутнасьці. Наша Чырвоная армія зараз—і мы гэта можам з гонарам сказаць—зьяўляецца ўзброенай і культурнай сілай. Яна ў поўным сэнсе слова зьяўляецца вялікім вартавым нашых родных, крывёю апырсканых, неасяжных савецкіх сацыялістычных межаў. (Аплёдысмэнты).

С. ВІХРОЎ (С. Богуш)

Марылька Шчаглова

(НАРЫС)

Стройная, бадзёрая, густыя пасмы бялявых валос закінутыя па мужчынску ўверх. Чорныя бліскучыя вочы.

Твар з усьмешкай. Цела ўросшае ў драгунскае сядло.

Гэта—Марылька.

Марылька Шчаглова — герой грамадзянскай вайны, з ордэнам Чырвонага сьцягу.

Гэта камэска (камандзір эскадрону).

Яна, Марылька, прайшла ўсё гарніла грамадзянскай вайны, і зараз заўзята гарцуе на сваім вараным „аганьку".

Колькі непахіснай сілы, волі ў яе сухіх, але магутных руках.

***

У маленькай хатцы з перакошанымі вакенцамі на невялічкай станцыі — Таміліна расла і гадавалася рухавая Марылька.

Банды, нібы ваўкі на раздарожжы расставілі свае вострыя зубы, сьцягвалі кольца, каб задушыць маладую краіну Саветаў.

— „Пралетар, на кавя!"

Пачуўся гэты магутны зазыўны кліч.

Рабочыя, моладзь, згуртаваўшыся ў атрады, ішлі абараняць краіну.

***

Вечар. Вецер — зьлюка скрабецца ў дзьверы, лезе па даху, залазіць пад лісты жалеза, адтуль на гару і разгульвае па цёмных лябірынтах.

Спатыкаецца, хутаецца сярод камяніц, хламу і зьнікае.

Дождж барабаніць, стукае ў вокны.

Стогне зямля ад сьвісту ў паветры і выбухаў сталёвых снарадаў, якія рвуцца недзе тут недалека.

Бацька моўчкі нешта ўкладвае ў сундучок.

Нібы страла ўскочыла Марылька з лаўкі, падбегла да свайго калматага, чорнага ад вугольнага пылу бацькі, толькі што зьлезшага з цягніка, і проста ў вочы:

— Тата, куды гэта?

Адапхнуў яе бацька ад сябе і потым, нібы падаючы пару ў кацёл, сказаў:

— Вая-ваць... краіну ратаваць.

Моўчкі адышла Марылька, села на ложак, яе галава нізка схілілася ад думак.

— Ну, бывай, Ганна. І ты, Марылька, калі давядзецца жывым вярнуцца, вярнуся, а не... І Кузьма Шчаглоў пакінуў халодную, аблезлую хату.

— Пачакай, тата, і я з табою, — раптоўна ўскочыўшы, крыкнула Марылька.

— Куды?.. Куды? На печку пашла. Да маці лепш пільнуй.

Але галаву Марылькі ўвесь час сьвідравала думка, яе яна не выпускала ні на хвіліну і цярпліва насіла ў сваёй галаве.

— На фронт! Абараняць краіну!..

***

— Ды адчапецеся вы ад мяне. Ну, не паслухала бацьку. Уцякла.—І камандзір эскадрона Шчаглова, прыціснуўшы да ілба палец, па якім гулялі маршчынкі, гаварыла далей.

Ну, а потым фронт. Работа тэлефаністкай і праз некалькі месяцаў мяне—Міхася Шчаглова перавялі ў разьведку,—сьмяецца Марылька Шчаглова.

— Доўгі час таіла, што я жанчына, усё Міхась ды Міхась.

— Ну, а потым усё і раскрылася, даведаліся, што гэта быў ня Міхась.

І камэска Шчаглова зноў апушчае галаву і, нізка схіліўшыся да карты, пачынае вывучаць рэльефы мясцовасьці, дзе заўтра адбудзецца вучэньне эскадрону.

— Таварыш Шчаглова ..—нібы пакрыўджаныя лезем мы да яе. — Ды раскажэце толкам, вельмі цікава. Дальбог цікава.

— Вам вось цікава, а ў мяне заўтра вучэньне дый эскадрон байцоў, — з нейкім дакорам пакруціўшы галавой дадала:

— Вось гэтыя пісьменьнікі, жыцьця мне няма ад іх.

— Ды раскажэце.—І, ідучы на хітрыкі, дадаем:—Ну, раскажэце хоць пра тое, за вошта вось гэты мідаль у вас, — прабуем жартамі ўцягнуць у размову гэтага неахвотлівага на словы камэска.

Зьмерыла нас Марылька Шчаглова калючым поглядамі панёсься яе агрубелы, амаль мужчынскі голас.

— Фронт... Баі... Грымяць снарады... Кроў... Мы ў кольцы.

Цяжка ўздыхае камэска, успамінаючы пра мінулыя цяжкія баі, якія зараз яшчэ востра сядзяць у галаве. Мы навастрылі вушы.

— Тады я была камзводам, атрымала ад кампалка загад—выведаць ворага. Ну і паехала. Гразь па калені. Коні ледзь вызягваюць ногі, сьвішча вецер. Ліжа твар. Б'е ў вочы, сьцягвае з коняй. Калі падлятаем да вёскі, эскадрон ворага моцнай сьцяной прэ на нас.

— Шаш—кі да бою! І, зрабіўшы ў паветры нейкі крэндзель рукой, яна гаварыла далей:

— Доўга біліся. Дзесятак сваіх страцілі. Шкода было. Дый мяне крышку шарпанулі. Месяц цэлы потым у шпіталі ляжала. У водпуск адпускалі, не паехала. Адмовілася. І зноў паехала на фронт дабіваць банды, граміць генэралаў. Ну вось за гэта і ордэн атрымала.

— Шмат раз была паранена, але сілы ў мяне. Во!—І камэска, падняўшы ўгару руку, моцна патрасла ў паветры.

Жыцьцёвы шлях Марылькі Шчагловай — гэта шлях грамадзянскай вайны. Шлях героя-чырвонасьцяжніка.

Яна і зараз адзін з лепшых камандзіраў эскадронаў і зараз, працуючы над сабой, бярэ ўпарта Перакопы, Сівашы вучобы.

***

Нібы маланка, прэ вараны канёк, сьцелецца да зямлі. Ляціць.

— Не падгадзь, дружа.—І камэска Шчаглова ляціць да фінішу.

Нібы рубячы галовы, здымае Шчаглова вяршалінкі лазінак у часе рубкі.

Стаіць камандаваньне, усьміхаецца, вядуць размовы:

— Ці знойдзеш рубаку падобнага да яе. Вось дык баба. Агонь!

— Яна і рубака, яна і на скачках шмат каму нос утрэ і, бя-

ВАЕННА-САНІТАРНЫ ЦЯГНІК № 227

(*Успаміны*)

У пачатку 1917 году я працавала ў якасьці старшага доктара ваенна-санітарнага цягніка № 227 пры Харкаўскім эвакуацыйным пункце. У канцы 1917 году была камандзіравана атрадам Паўночнага штабу ваенна рэвалюцыйнага камітэту па барацьбе з контррэвалюцыяй, у якасьці загадчыка эвакуацыі і для лячэньня параненых чырвонагвардзейскага атраду трэцяй калёны рэвалюцыйных войск пад кіраўніцтвам т. Сіверса.

У 1918 годзе гэта калёна ўзяла з боем горад Таганрог і Растоў-на-Дану, вядучы барацьбу супроць белых казакаў, якімі кіраваў Каледзін.

Вось адзін цікавы малюнак з пераможнага наступленьня Чырвонай гвардзіі пры ўзяцьці гораду Таганрогу:

Войскі застанавіліся на апошнім разьезьдзе перад станцыяй Таганрог, белыя абаранялі горад. Наша камандаваньне прыбегла да тактычнай улоўкі — быў пушчан паравоз на поўны ход, без кіраваньня, які ўляцеў на станцыю Таганрог, урэзаўся ў тупік на пэрон і выламаў частку сьцяны вакзалу. Гэтым было зроблена ашаламляючае ўражаньне, якое выклікала такую паніку, што белыя пакінулі станцыю.

8 лютага 1918 году Таганрог быў узят калёнай Сіверса пры падтрымцы паўстаўшых рабочых. Белыя адступілі па ільду Азоўскага мора на Растоў, і частка белых войск перайшла на бок чырвоных. Пасьля гэтага атрад Сіверса накіраваўся на Растоў-на Дану. Санітарная лятучка на чале якой стаяла я, рухалася непасрэдна з атрадам. У гэты-ж час да Нова-Чэркаска падступаў т. Саблін — другая калёна рэвалюцыйных войск. Каледзін абкружаны чырвонымі, бачачы сваё дрэннае становішча—застраліўся.

23 лютага а дзесятай гадзіне ўвечары была ўзята станцыя Растоў, а ў дзьве гадзіны ночы—горад Растоў. Паасобныя часткі казацкіх белых войск зьвярнуўшыся з фронту адмаўляліся ваяваць супроць чырвоных, і разыходзілася па хатах, частка пераходзіла на бок чырвоных. Пасьля ўзяцьця Растову мы павінны былі быць перакінуты ў Ленінград, але затрымаліся ў Курску і накіраваліся на Канатоп-Бахмач.

Вясной 1918 году атрад Сіверса быў накіраван праз Харкаў на Купенск, Валуйкі, Нова-Хапёрск, Барыса-Глебск, станіцу Урюпенскую. У гэты час атрад Сіверса называўся 5 арміяй Южна рускіх, Савецкіх рэспублік і вёў барацьбу супроць Краснова, камандуючага казакамі.

Весткі аб арганізацыі Чырвонай арміі дакаціласа да нас толькі ў чэрвені месяцы. Мы ўвесь час працягвалі весьці партызанскі характар вайны. У ліпені мы стаялі на станцыі Паворына. Атрад Сіверса быў тады пераіменован у брыгаду другой асобнай арміі. Радам з намі па напрамку да Царыцына стаяла дывізыя Кіквідзе. На поўдні атрад матроса Дыбенка (здаецца Дыбенка). Увечары прыбыла тэлеграма аб патрэбнасьці дапамогі дывізіі Кіквідзе.

Камандзір брыгады, Сіверс, у той час адсутнічаў. Узгадніць свае дзеяньні з ім я не магла і самастойна накіравалася з санітарным цягніком да Поўдня.

Мяне папярэдзілі, што становішча там небясьпечнае і мне можа не прыдзецца зьвярнуцца. У начы з патухшымі вагнямі, медленна рухаўся цягнік па нейтральнай паласе ў раён распалажэньня войск дывізіі Кіквідзе. Дапамога недасьпела сваячасова. Чакалася наступленьне белых і была небясьпека, што нашы часткі могуць быць адрэзаны.

Я абмалявала камандзе сучаснае становішча і прапанавала жадаючым застацца са мной у летучцы. З 79 чалавек засталося толькі 11, а астатнія былі накіраваны вечарам апошнім эшалёнам у тыл. Уначы мы былі адрэзаны ад Поўначы. Тыдзень мы стаялі на станцыі Ф.

У нас было зацішша, была толькі маленькая перастрэлка. З Поўдня прыбывалі эшалёны таварных цяплушак перапоўненымі параненымі чырвонагвардзейцамі і партызанамі з атраду казака Андрэява. Гэты тыдзень лятучка працавала бяз сну.

У ясны летні дзень пачаўся бой. Загрымелі гарматы, затрашчалі кулямёты, засьвісьцелі кулі, у паветры стаяў гул, стоны. На станцыі загарэліся цягнікі ад гарматаў. Вопытны машыніст манэўраваў ратуючы лятучку ад пажару. Ня маючы магчымасьці з-за ўраганнага абстрэлу адцягнуць састаў у спакойнае месца. Праз некалькі хвілін сьціхла батарэя ворага і састаў праехаў за лінію агня.

Штаб дывізіі Кіквідзе маючы на ўвазе, што становішча небясьпечнае выслаў мне верхавога каня для адступленьня. Ставячы інтарэсы рабочай клясы, інтарэсы байцоў вышэй сваіх, я адмовілася і засталася на лініі бою. Складзенымі сіламі дывізіі Кіквідзе і брыгады Сіверса мы атрымалі перамогу, станцыя Ф. засталася за намі.

Вясной 1922 году з апошняй дэмабілізацыяй дактароў жанчын я перайшла на працу ў савецкія медустановы.

Доктар Башмакова.

МАРЫЛЬКА ШЧАГЛОВА (*канец*).

ручы перашкоды, таксама не паддаецца—устаўляе свой голас камісар палка.

— Камэска што трэба. А вось ведаеш, зараз хадайнічаць трэба, каб узнагаралзілі яе зноў.

— За што?

— А ці ты ўжо забыў.

— Ага, памятаю,—разам меркавалі і потым дадаў:

— Тры гады па ўсіх галінах баявой падрыхтоўкі трымаць пяршынства—гэта ня жарты.

— Таварыш камандзір палка! Дазвольце далажыць, што ў часе стральбы з нагану, я заняла першае месца. — Нібы рубячы, дакладае камэска Шчаглова.

— Малайчына.—І суровы кампалка з шчырасьцю паціскае руку.

Не адстае эскадрон Шчагловай і ў палітрабоце.

Гэта разьдзел яе эскадрону заняў першае месца ў часе палітбою.

Шчаглова-бальшавічка.

Загартаваная бальшавічка. Вось чаму ў яе столькі сіл і перамог.

Люты, 1933 г.

Будзённаўцы

У лютым 1931 году Менскі райсавет АСО, даручыў Навуму Майсеевічу Дзімэнштэйну правесьці арганізацыйную работу па фармаваньні атраду ПВО на фабрыцы імя Крупскай. Цяперашні начальнік штабу—т. Дзімэнштэйн энэргічна ўзяўся за справу. А ня лёгка было прыцягнуць работніц да працы. Згуртавалі актыў. Лепшыя ўдарніцы фабрыкі сталі ўдарніцамі абароны. **Екельчык, Цыпіна, Рагодзіна, Зусмановіч, Дзімэнштэйн, Салавейчык, Шыфрына, Анцылевіч, Дарошка, Горэнгляд, Жукоўская**—вось першыя арганізатары атраду. Пазьней захопленыя прыкладам перадавых, уступалі ўсё новыя і новыя работніцы. А зараз ужо атрад ахапляе каля 30 проц. работніц фабрыкі. Па-баявому працуе атрад імя Будзённага.

У цэнтр пастаўлена барацьба за аўладаньне тэхнікай супроць-паветранай абароны.

Манэўры 1931 году зьявіліся баявым экзаменам для будзённаўцаў. Збор быў праведзен раней вызначанага тэрміну. Работы па дэгазацыі былі прароблены ў поўнай адпаведнасьці з пагрэбаваньнямі баявой абстаноўкі. У момант „нападу" ў прыгараднай частцы гораду зараз-жа пачаў працаваць мэдпункт. За такую энэргічную і ўдарную работу на манэўрах, 30 чалавек былі прэміяваны і акрамя гэтага кожная работніца — удзельніца манэўраў атрымала туфлі.

Вайсковая вучоба на фабрыцы імя Крупскай сапраўды зьяўляецца прыкладам для іншых. Сыстэматычная работа атраду па асваеньні ваеннай тэхнікі правяраецца ў розных формах.

Памяшканьне фабкому ноччу з 27 на 28 верасьня 1932 г. гудзе нязвычайна, спаць ніхто ня думае.

Работніцы сюды сабраліся па першым клічы штабу аб'екту. 11 гадзін ночы, усе з супроцьгазамі ў поўнай гатоўнасьці. Настрой узьняты, бадзёры, кожны хоча сябе паказаць на справе як ён умее абараняць бацькаўшчыну пралетарыяту. Дзякуючы зацікаўленасьці работніц, атрад у часе трывогі бліскуча справіўся са сваімі абавязкамі. Асабліва добра працавала дэгазацыйная каманда на чале з начальнікам каманды тав. Цыпінай і Салавейчык. Пост ПНАР (паветранае назіраньне, апавяшчэньне, разьведкі) у свой час быў на месцы і зрабіў разьведку вельмі добра. Партыйная і камсамольская арганізацыі праводзілі ту таркі на палітычныя тэмы, былі выпушчаны газэты.

Дзімэнштэйн

Так лепшыя ўдарніцы прадпрыемства, зьяўляюцца лепшымі ўдарніцамі абароны.

За добрую працу, у часе трывогі дэгазацыйнай камандзе і пасту ПНАР вынесена падзяку ад штабу.

Заслугоўвае ўвагі ўдарная праца палітрука атраду **Екельчык Рывы**. Прапрацаваныя тэмы аб міжнародным становішчы, аб санспаборніцтве, аб выкананьні прамфінпляну — даюць вельмі добры эфэкт, павышэньне тэмпаў і якасьці працы ў галіне выкананьня прамфінпляну. Вялізную работу атраду па выхаваньні з работніц сьвядомых барацьбітоў за прамфінплян, за абарону, можна прасачыць на прыкладзе работніцы **Пукач**.

Пукач у часе трывогі адмовілася ўзяць барабан. На праведзеным тут-жа сходзе яе выключылі з атраду і камсамолу. Вакол гэтага факта мабілізавалі ўвагу работніц на барацьбу за шьвёрдую дысцыпліну. Гэта мела ўплыў і на Пукач. Калі праздзьве гадзіны зноў загулі гудкі, Пукач першая была на фабрыцы і ядлана працавала па абароне. Яе прэміявалі за добрую працу і сваячасовую яўку. Яна стала ўдарніцай абароны.

Работніцы з задавальненьнем расказваюць аб добрай баявой працы атраду, які даў магчымасьць аўладаць тэхнікай супроцьпаветранай абароны. Немалую ролю ў гэтым адыграў начальнік штабу тав. Дзімэнштэйн.

т. Екельчык праводзіць палітчас у атрадзе

Зараз набліжаецца двухгадовы юбілей атраду. У часе падрыхтоў і да юбілею і 8-га сакавіка работніцы групамі ў тупаюць у атрад. Істужкі абвясьцілі сябе вай ковымі. Некалькі істужак змагаюцца за пераходны сьцяг атраду і бюст Будзённага.

Кандыдатамі на атрыманьне іх зьяўляюцца 6 і 4 істужкі, якія на справе паказваюць узоры бальшавіцкай работы па выкананьні прамфінпляну і прыклад па рабоце ў атрадзе. Новаўступіўшыя старыя работніцы (**Кузьмянова, Піскун і Хромава**) актыўна наведваюць заняткі і цягнуць за сабой моладзь. У дзень юбілею і 8-га сакавіка з атраду выпускаюць, як скончыўшых падрыхтоўку, лепшых ударніц—удзельніцаў атраду, якія залічваюцца ў рэзэрв і пры першым клічы штабу будуць на месцы.

У будзённаўцаў ёсьць чаму павучыцца. Яны зразумелі ўсю важнасьць абароны краіны і ператварылі фабрыку ў сапраўдную крэпасьць абароны.

Застаецца ім толькі пажадаць больш плённай працы ў далейшай барацьбе за аўладаньне ваеннай тэхнікі.

Камісарава.

Новаўступіўшыя ў атрад работніцы на занятках, Кузьмянкова, Тунік, Піскун, Хромава.

Пратворым АСОАвіахім у несакрушальны сталёвы рэзэрв Чырвонай арміі!

Няхай жыве нераможная Чырвоная армія — верны вартаўнік мірнай працы рабочых і сялян Савецкага Саюзу!

1) Цыпіна, нам. нач. хэмкаманды. 2) Екельчык — самы лепшы палітрук атраду. 3) Анцылевіч — ударніца хэмкаманды. 4) Мазелева, пом. нач. посту ВНАР.

Ператворым фабрыку ў ЦЫТАДЭЛЬ АБАРОНЫ

Раўняцца па менскім абутніцам

Рыхтуючыся да 15 гадавіны Чырвонай арміі, рабочыя Менскай абутковай фабрыкі падагульваюць сваю працу па абарончай справе. 13 ячэек Асоавіяхіму праводзяць работу ў нізавых цэхавых зьвеньнях. Ёсьць 600 членаў Асоавіяхіму.

Дырэкцыя абарончую работу лічыць важнейшым вучасткам работы. Абсталёван вайсковы куток, вакол якога групуецца ўся ваенная работа. Прадстаўлен крэдыт рабочым для набыцьця супрацьгазаў, уведзены дадатковыя абеды для асоавіяхімаўцаў, якія займаюцца ў вайсковых гурткох. Пры фабрыцы працуе шір. Тут з 50 членаў стралковага гуртка выяўлены лепшыя стралкі, сярод лепшых ёсьць і работніцы, як тав. Сьляпян—работніца другога пашывачнага цэху, якая ў стральбе ня ўступае любому камандзіру.

Арганізуюцца гурткі па вывучэньні аўтамабільнай і хэмічнай справы. Сувязь з падшэфнай часткай Чырвонай арміі—гэта ня голае прадстаўніцтва, а жывая канкрэтная дапамога. 4 камандзіры падшэфнай часткі кіруюць вайсковымі гуркамі, вопыт работы ўдарнікаў-байцоў, іх дысцыплінаванасьць перадаецца праз фабрычны друк рабочым шляхам абменных палос. Дапрызыўнікі—актыўныя асоавіяхімаўцы, яны ўсе на вучоце, малапісьменныя займаюцца ў лікбезах.

Бесьперабойна, па-вайскозаму працуюць 4 каманды СПА, якія дабіліся 100-проц. наведваньня і добрага ўсвойваньня заняткаў. Кожная каманда ўзбройваецца і палітычнымі ведамі. Шырока разгорнута грамадзкая работа, усе чатыры каманды выпускаюць свае насьценныя газэты, якія адыгрываюць вялікую ролю ў справе разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў вайсковай вучобе.

Лепшай ударнай камандай на фабрыцы лічыцца санітарная каманда, яна складаецца амаль выключна з жанчын-работніц. Тут амаль усе члены каманды зьяўляюцца кваліфікаванымі санітарамі і палітычна падрыхтаванымі байцамі—гэта каманда самая ініцыятыўная. Па яе закліку разгорнута сацспаборніцтва паміж усімі камандамі, па яе прыкладу іншыя атрады арганізавалі насьценгазэты. Гэта каманда цалкам ліквідавала прагулы і спазьненьні, узьняла дысцыпліну. Санітары па-вайсковаму адносяцца да заняткаў, да выкананьня загадаў з боку свайго начальства.

У камандзе выяўлены лепшыя ўдарнікі вайсковай вучобы, якія зьяўляюцца і ўдарнікамі па выкананьні прамфінпляну. Адзначэнныя камандзіры—**Юдзялевіч, Нісялевіч і Юдава** і санітары **Сапожнікава, Гладун, Клёнская, Фішкіна** і інш. Санітарная каманда работу сваю цесна зьвязвае з работай вытворчасьці: санітары дзяжураць на мэдпункце, працуюць у цэхавых санпастох, зьяўляюцца зусім кваліфікаванымі па аказаньні першай дапамогі.

У швэйным цэху быў выпадак, калі работніца папала ў трансьмісію ў часе работы, і вось санітар, тав. Палеес, ня спужаўшыся, сьмела і рашуча, як зусім кваліфікаваны санітар, разрэзаў шалік, які цягнуў галаву работніцы, спыніў матор і, аказаўшы зусім правільную першую дапамогу, сваячасова даставіў яе на мэдпункт.

Зараз каманда рыхтуецца да вучэбных манэўраў і яшчэ больш напружана працуе, каб здаць экзамэн баявой падрыхтоўкі. За гэтай перадавой камандай ідуць і іншыя.

Такім чынам, адзіны плян вайсковай работы на фабрыцы пабудован так, што ў яго выкананьні прымаюць удзел усе грамадзкія арганізацыі, прыцягнут шырокі актыў рабочых. Абарончая работа ўвязана з вытворчай: „Кожны ўдарнік—актыўны асоавіяхімавец, кожны асоавіяхімавец—ударнік вытворчасьці"—вось лёзунг абутнікаў. І на справе мы бачым, што тыя дзьве гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якія носяць імя Асоавіяхіму і імя 15 гадавіны Чырвонай арміі, поўнасьцю выконваюць прамфінплян, а 4-ая асоавіяхімаўская брыгада закройшчыкаў значна палепшыла якасьць прадукцыі.

Жывую хвалю ва ўсю абарончую работу ўнёс вылучаны бюро парткалектыву ваенорг **т. Рэйнгольд.**

Але, ня ўсё яшчэ зроблена. многа недахопаў, многа недароблена—ня ўвесь рабочы калектыў у радох Асоавіяхіму, не навучыліся яшчэ замацоўваць посьпехі, працаваць плянава, сыстэматычна. Слаба яшчэ разгорнута масавая работа вакол пытаньня абароны, вакол ажыцьцяўленьня пастаноў XII пленуму ВККІ (Выканаўчы Камітэт Камуністычнага Інтэрнацыяналу), які адзначыў, што над Савецкім саюзам—бацькаўшчынай сусьветнага пралетарыяту—вісіць пагроза ваеннай інтэрвэнцыі, што пад шумок размоў аб міры і раззбраеньні ў Жэнэве ідуць закулісныя таргі, заключаюцца ваенныя блёкі, вядуцца правакацыі.

Гэта шалёная ваенная падрыхтоўка накіравана супроць СССР, і зарука далейшых перамог нашай мірнай палітыкі—гэта ня супынная барацьба за бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі краіны.

Хэмкаманда за вывучэньнем палявога ветрагона.

Успам'ны з польскага фронту

Лета 1920 году. Грамадзянская вайна ў поўным раз ары. З фронту даносяцца весткі, што бальшавікі наступаюць на Варшаву.

Пры кожным новым паражэнні польскіх войск на фронце больш разьюшанай станавілася буржуазія. Рэвалюцыйны рух бязьлітасна прыдушваўся. Польская буржуазія на рост рэвалюцыйнасьці мас адказвала нацыянальным прыгнечаньнем, пагромамі, зьдзекамі над працоўнымі, асабліва жорсткімі былі гэтыя зьдзекі над нацменшасьцямі. У прыватнасьці, гэта вельмі адчувалі рабочыя-яўрэі. Рабочаму-яўрэю нельга было прайсьці па вуліцы, над ім усяк зьдзеквал ся польскія легіянэры—стаўленікі паноў. Пажылым яўрэям рэзалі борады з мясом і калі цякла кроў, легіянэры іх прымушалі танцаваць, выкрыкваючы словы: „Няхай жыве Пілсудзкі".

У нашым горадзе — Парчэў, Люблінскае ваеводзтва, былі арыштаваны ўсе кіраўнікі камуністычнай арганізацыі. Клюб быў закрыт. Камуністычная арганізацыя працавала ў глыбокім падпольлі.

І вось у ліпені месяцы стала ўсім вядома, што чырвоныя войскі пераможна наступаюць на Варшаву. У другую палову ліпеня быў заняты Брэст-Літоўск і яшчэ рад гарадоў Заходняй Беларусі. Чырвоныя набліжаліся да нашага гораду ў канцы ліпеня.

Памятаю тую жудасную ноч, калі адступалі белапалякі. Белапольскія войскі дзіка расправуляліся над працоўнымі, асабліва яўрэямі. Ноч была цёмная. Усе хаты шчыльна закрыты. Толькі чуцён быў звон разьбіваемага шкла абрабаваных хат. Гэта зьлівалася з енкамі і крыкамі згвалтаваных дзяўчат.

Нарэшце, раніцой паказалася першая чырвоная разьведка.

З пачатку нам ня верылася. Чырвоныя зоркі з сярпом і молатам на шлемах запэўнялі, што гэта чырвоныя войскі.

Працоўны люд высыпаў на вуліцу, гутарылі з чырвонаармейцамі, расказвалі аб дзікіх расправах белапалякаў напярэдадні адступленьня. Усё як быццам у горадзе перарадзілася, нібы настала вясна і ўсё расквітнела. Зразумела, што зараз клюб быў адкрыты, і камуністычная арганізацыя выйшла з падпольля.

У дзень прыходу чырвоных начальнік 57 дывізіі склікаў сход камуністычнай арганізацыі разам з камсамольцамі і прапанаваў выбраць рэўком для кіраўніцтва горадам. Старшынёй рэўкому абралі тав. Гэршбэрга, сакратаром—мяне.

На гэтым сходзе мы таксама заслухалі даклад аб выніках другога кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Цяжка апісаць усе ўражаньні. Я сядзела і ня верыла, што бачу ўсё гэта сваімі ўласнымі вачыма. Здавалася, што гэта сон. Цяжка было верыць, што мы, якія толькі два дні таму назад прымушаны былі працаваць у падвалах для таго, каб падрыхтаваць працоўных у бой за сьветлае жыцьцё, што мы зараз ужо прагналі паноў, што ў нас, як і ў Савецкім саюзе, будуць саветы.

Мае мары прарваў жудасны гул гарматаў і трэск кулямётаў. Раптам пачалася паніка. Чырвонаармейцы сталі адступаць, а за імі і ўсё рэвалюцыйна-настроенае насельніцтва гораду. „Ня хочам заставацца ў польскіх паноў"—даносіліся крыкі адступаўшых жыхароў г. Парчэў.—„Бярэце нас з сабой".

Наша партыйная арганізацыя таксама адступіла разам з Чырвонай арміяй. Мы адступілі да бліжэйшай вёскі. Чырвоныя войскі адагналі белапалякаў, і мы зноў вярнуліся ў горад.

Чырвоная армія была ў нас пяць дзён. За гэты час мы яшчэ раз адступалі і зноў варочаліся. Вораг быў усяго за некалькі кілёмэтраў ад гораду.

І вось пасьля пяці дзён быў дан загад—эвакуявацца. Равей адступілі жанчыны-камуністкі і камсамолкі, якія не маглі заставацца ў горадзе. Пайшлі быццам на спацыр, і ніхто не разумеў, што мы адступаем.

Пяхотай мы дайшлі да Брэст-Літоўску.

Брэст-Літоўскі партыйны камітэт мабілізаваў нас на фронт і разьмеркаваў па розных часьцях.

Я папала ў Пінску ў 1168 шпіталь пры 57 дывізіі. Працавала ў якасьці санітаркі. Там было многа ваенна-палонных і я праводзіла з імі гутаркі на польскай мове і чытку газэт.

У канцы жніўня шпіталь эвакуяваўся і мяне прыкамандыравалі да брыгаднага лязарэту літар „Е". Тут я выконвала абавязкі санітаркі і сястры.

У пачатку верасьня пачалася эвакуацыя Пінску. Нам было дана заданьне ўпакаваць усю лязарэтную маемасьць. У горадзе было трывожна. Адступалі.

Ужо балахоўцы былі за некалькі кілёмэтраў ад гораду, калі прышоў ваенком і даў загад нам адступаць. Уся каманда ўжо адступіла. Коняй ня было. Прышлося адступаць пехатою. У горадзе быў жудасны малюнак. Усё зьмяшалася ў адно: людзі, коні, фурманкі. Кулі сьвісьцелі. У рываліся снарады. Сагнуўшыся пад градам куль, мы ішлі. Вось узрываецца снарад, падае чалавек з боку ад цябе, але на гэта не глядзіш і бяжыш далей.

Так мы адступалі да Лунінца. З нашай каманды засталося толькі 9 чалавек. У Лунінцы мы прыкамандыраваліся да шпіталю—прыёмніка пры 154 эвака-пункце. У часе адступленьня мы аказвалі дапамогу хворым і параненым чырвонаармейцам і бежанцам.

Нарэшце, мы дабраліся да Новазыбкава. У канцы кастрычніка мы разгарнулі работу шпіталю для тыфусных хворых. Працавала я санітаркай. У маёй палаце было 56 цяжкіх хворых, але я з работай спраўлялася. Па загаду палітрука праводзіла гутаркі з чырвонаармейцамі. Мяне выбралі на чырвонаармейскую канфэрэнцыю ў горад Смаленск, але тыфус, на які я сама захварэла, ня даў мне магчымасьці паехаць.

У 1921 годзе, калі заключана было перамір'е, усе хворыя чырвонаармейцы пачалі гутарыць аб доме, аб сям'і і гаспадарцы. Гэта якраз было вясной. Часта былі такія гутаркі: „Калі-б ня гэта хвароба—спадчына фронту, мы-б хутка да хаты паехалі. Там нас чакаюць палі, якія мы павінны засеяць". Чырвонаармейцы-рабочыя ўспаміналі свае фабрыкі і заводы, да якіх яны хутка вернуцца.

Е. Эпштэйн.

ГЕРОІ САЦЫЯЛІ

Прыёмная Наркамзему напоўнена ажыўленым гоманам, звонкім сьмехам дэлегатаў. Мімаволі заражаюць яны вас сваёй бадзёрасьцю. Праз некалькі гадзін гэтыя лепшыя з лепшых калгасьніцы, калгасьнікі адпраўляюцца на Ўсесаюзны зьезд у Маскву падзяліцца сваім вопытам бальшавіцкай работы, пераняць вопыт другіх.

— Маскву пабачу, раскажу аб нашых калгасных посьпехах і недахопах,—з гонарам заявіла Алена **Кароль**—лепшая ўдарніца лепшага на Случчыне калгасу „Карла Маркса".

Яна заслугоўвае гэтага. Маючы траіх маленькіх дзяцей, яна выпрацавала 210 працадзён. Ніхто іншы, як Алена, зьяўляецца застрэльшчыкам хуткай апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве. У выніку яе ініцыятывы калгас датэрмінова выканаў плян ільназагатовак на 102 проц. Алена працуе сапраўды па-бальшавіцку і заражае сваёй энэргіяй іншых.

— Я ніколі сябе не адчувала такой жывой, вясёлай, здаровай, як зараз. Ці думала гэта я, насіць калі паліто ды 'шчэ з каўняром. А тое, што мы атрымалі на працадні, то раней і дзесятай долі таго ня мелі. Жывем у чыстых прасторных кватэрах, пабудаваных ужо ў калгасе. Толькі працуй, а, хто ў нас працуе, той і мае. Напрыклад, Дудар Дзямян: у яго—чатыры працаздольныя, выпрацавалі 1.416 працадзён, атрымаў 218 пудоў збожжа, 432 пуды бульбы і 1.418 руб. грашыма. Пуцэйка Маланка, даглядаючы сьвіней, атрымала 65 пудоў збожжа, 129 пудоў бульбы, 423 рублі грашыма.

Вялікую палёгку прынёс калгас іменна нам, сялянкам. І сапраўды, раней, жывучы ў адна-асобніках жанчына працавала нараўне з мужчынай і апрача таго яшчэ ёй трэба было варыць, ежу, няньчыць дзяцей, даглядаць жывёлу.

А ў калгасе жанчына, асабліва ў гарачы час уборкі і сяўбы, вызваляешца ад кухні праз наладжаньне паходна-палявога харчаваньня, а таксама праз ясьлі і пляцоўкі.

Жанчыны, што ў пачатку калектывізацыі больш за ўсіх бузілі і крычалі, зараз яны мацней за іншых стаяць за калгас. Яны на практыцы росту калгасаў пераканаліся ў іх перавазе.

— Прэміявалі мяне два разы,— кажа Алена.

Слухаючы расказы Алены, ня вытрымала ўдарніца Фядора Вішнякова з Лёзьняншчыны (калгас „Адказ інтэрвэнтам"): „А вось мяне чатыры разы прэміявалі".

— Фядора найлепшая з брыгадзіраў у калгасе. Лён яна вырасьціла ня дрэннай якасьці, ніжэй дзесяткі не здавала,

— Мая брыгада ня толькі сама добра працавала, але брала на буксір адстаючыя брыгады калгасу „Іскра" і калгасу „Страх ворагам". Добра працуе дэлегацкі сход, які навучае нас шмат чаму. Ёсьць 10 дэлегатак. А таму ўсюды ёсьць наша дэлегацкае вока. Дэлегаткі прымацаваны да ўсіх галін гаспадаркі. Пасьля здачы загатовак мы шчыра ўзяліся за падрыхтоўку да вясны. Насеньне поўнасьцю ссыпана і ачышчана, інвэнтар адрамантаваны, хоць сёньня выяжджай на поле. Спэцыяльная брыгада дэлегатак кожныя дзесяць дзён правярае ў якім становішчы знаходзіцца насеньне. Створаны ўжо сталыя вытворчыя брыгады.

— У нас жанчына займае адказныя пасады, гаворыць Лізавета Цурыкава з калгасу „Новы араты", загадчыца МТФ (Касьцюковіцкі раён).

— Дзьвёх жанчын вылучылі брыгадзірамі, вельмі добра ў мяне на фэрме працуюць 6 жанчын. Тры нашыя жанчыны члены сельсавету, дзьве члены праўленьня. Па-баявому працуе дэлегацкі сход. У нас усяго 20 дэлегатак, але на сходах бывае жанчын заўсёды значна больш. Бо мы ставім жыцьцёвыя пытаньні, якія цікавяць усіх жанчын і не дэлегатак, аб загатоўках я ўжо і не гавару, бо мы даўно іх выканалі і забылі. Шмат нам дапамагае ў працы дэлегацкі сход.

— У мяне трое дзяцей, але ж выпрацаваўшы 344 працадні, ды мяне яшчэ прэміявалі 10 праца-

---

Дэлегаты зьезду

1) Кароль Алена.
2) Цурыкава Елізавета.
3) Дземка Прузына.

СТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ

днямі, я поўнасьцю забясьпечваю і сябе і дзяцей харчаваньнем.

18-гадовая Прузына Дземка з Лепельшчыны (калгас „Новае жыцьцё) расказвае з захапленьнем пра сваю працу.

— Хоць мне ўсяго 18 год, але-ж я кірую самай адказнай брыгадай у нашым калгасе, брыгадай ільнаводчай.

— Засеялі 48 *га* ільну, сваячасова прапалолі, убралі, а таму і плян перавыканалі і здалі не абы які лён, а ня ніжэй 8—10 нумару.

— Дэлегаткі шмат у працы дапамагаюць — кажа яна пасьля невялікай паўзы.—Яны ў нас сачылі і за ссыпкай насеньня і за рамонтам інвэнтару. У быніку мы гатовы сеяць хоць і заўтра. У мінулым годзе ў нас пры разьмеркаваньні ўраджаю была поўная ўраўнілаўка. Вядома, гэта спрыяла лодыру і гультаю. У гэтым годзе зусім іншае. Працадзень—гэта ўсё.

— Мы таксама жорстка змагаемся з сымулянтамі і лодырамі—дадае Анэля Тарайковіч з Дзяржыншчыны (калгас „Барацьбіт"). Я хачу сказаць, што таму і жывем мы багата — усяго, слава богу, хапае — кажа па старой звычцы Анэля.

— Я ўдава, ўсё прыходзілася самой рабіць, бяз сіл застаешся, працуеш, працуеш, а тут то коні патопчуць, то сьвіньні, і ўсё роўна злыдня, пуця няма. А зараз ня тое. Я толькі і ведаю, што свой сьвінарнік. Хлеба і бульбы я атрымала столькі, што яшчэ частку прыдзецца прадаць. Маю карову, значыць, малако ёсьць, мела двое сьвіне , аднаго забіла на сала, а другога зьбіраюся забіць, курэй маю, авечак. Апрача выкананьня ўсіх відаў загатовак мы яшчэ 3 гоны бульбы здалі (прадалі) дзяржаве з атрыманай на працадні.

— Насеньне ўжо ўсё засыпана і ачышчана, не хапае толькі часткі вікі і сэрадэлі. Таму мы замест гэтага ссыпалі жыта і бульбу і абмяняем хутка дзенебудзь. Падрыхтоўка да вясны ідзе поўным ходам Працуе рымарная брыгада па рамонце хамутоў, сядзёлкаў, сталярня, кузьня, адным словам пакуль прыеду, ужо будзе ўсё гатова.

— Адно кепска, — скардзіцца Анэля, — што ніякай работы з жанчынамі не праводзіцца. Няма дэлегацкіх сходаў, ні заняткаў. А працуем-жа мы добра—пахвалілася яна.—Вось мне ўжо 58 год, а яшчэ маладым ножку падстаўлю. Выпрацавала 326 працадзён і атрымала дабра ўсяго столькі, колькі да калгасу і ня сьнілася.

— Жыць па-людзку мы пачалі толькі ў калгасе і, калі я ехала на зьезд, усе жанчыны прасілі мяне расказаць аб гэтым, каб увесь СССР ведаў. І яшчэ ўсе нашы прасілі перадаць палкае калгаснае прывітаньне т. Сталіну, чалавеку, які так многа зрабіў для нас, калгасьнікаў.

Так перадавыя калгасьніцы дзеляцца вопытам сваёй барацьбы за калгасы. Яны выразьней за ўсё даказваюць аб перавазе калектыўнай гаспадаркі, аб тым, што дабрабыт селяніна бедняка і серадняка, які вышаў з поўжабрацкага існаваньня няўхільна паляпшаецца. Пераняўшы вопыт перадавых ка гасаў СССР, калгасьніцы Беларусі яшчэ больш узмацняць барацьбу за ўраджай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Камісарава.

Дэлегаты зьезду

1) Вішнякова Тадора.

2) Сьвірыдзенка Праскоўя—ударніца к-су „Іскра" Чэрыкаўскі раён. Брыгадзір СТКФ. Выпрацавала 532 працадні

3) Казачонак Хрысьціна — ударніца к-су „Пралетарская перамога", 3 разы прэміявана. (Хойніцкі раён).

НАСЕННЫЯ ФОНДЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАСЫПАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ

„Яшчэ раз папярэджваю, што ніхто ня мае права спадзявацца на атрыманьне насеннай пазыкі ад дзяржавы. Мы будзем з вас пытаць, калі ня холіць насеньня. Трэба на мясцох накапіць насеньня для веснавой сяўбы. Гэта справа абавязковая для ўсіх".

(*З дакладу тав. Галадзеда на сэсіі ЦВК БССР*).

Чарапашныя тэмпы зьмяніць на бальшавіцкія

Марудна ідзе падрыхтоўка да вясны па Нікіцінскаму сельсавету. Праверка ссыпкі насенных і страхавых фондаў па калгасах паказала, што шмат насеньньня яшчэ не хапае, каб поўнасьцю забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі. Не хапае насеньня ільну, канапель і інш.

У калгасе „Пяцігодка" насеньне ячменю і аўса аказалася ў сырым выглядзе.

У калгасе імя Варашылава даведзен плян пасеву ільну ў 28 *га* з нормай высеву па 1,1 *цнт* на *га*. Значыцца трэба мець насеньня 30,8 *цнт*, а паводле арытмэтыкі райза выходзіць 29,5. Невядома па якіх прычынах райза зьнізіў плян ссыпкі насеньня ільну на 1,3 *цнт*.

У гэтым-жа калгасе ня ссыпаны страхавыя фонды.

Ачыстка насеньня, рамонт інвэнтару яшчэ не распачаты. Не праверапы поўнасьцю насенныя фонды ў аднасобным сэктары.

Нікіцінская ячэйка КП(б)Б і сельсавет у бліжэйшыя дні павінны дабіцца поўнага выкананьня плянаў па ссыпцы насенных і страхавых фондаў, арганізаваць ачыстку і рамонт інвэнтару, узмацніць догляд коняй, каб падрыхтаваць цягавую сілу да вясны.

А.

Шклоўскі раён.

Калгас „Расьсьвет" ня рыхтуецца да вясны

Ня гледзячы на тое, што тэрмін ссыпкі насенных і страхавых фондаў скончыўся 10 студзеня, у калгасе „Расьсьвет", Нікіцінскага сельсавету, жыцьцё цячэ мірна, як і раней, і аб патрэбнасьці сеяць вясной зусім забылі. Не хапае шмат насеньня, асабліва ільну. Паводле пляну трэба 42,5 *цнт*, ссыпана 11,14 *цнт*. Не хапае 11 *цнт* аўса, 35 *цнт* бульбы і інш.

Аб ачыстцы насеньня ніхто яшчэ нават і не падумаў. Інвэнтар патрабуе рамонту.

Старшыня калгасу тав. Бярнацкі толькі на паперы кіруе калгасам, а на справе ўся праца ідзе самацёкам. Такое становішча ў калгасе, калі чакаюць „манны з неба", можа прывесьці да зрыву пляну веснавой сяўбы.

Такое кіраўніцтва ні ў якім разе ня можа забясьцечыць умацаваньня калгасу.

К.

Шклоўскі р.

Сабатажнікам ня месца ў калгасе

Кулацкі сабатаж загатовак ільну ў калгасе „Новы строй", Чарнаруцкага сельсавету, яшчэ ня зломлен. Лён парасьцягвалі, пахавалі і зараз не здаюць.

У члена сельсавету Шапялёва Васіля, знайшлі 4 вязкі схаванага ільну.

У старшыні рэвізійнай камісіі Шапялёва Нічыпара знайшлі лён, схаваны пад падушкай.

Волкава Параска калгасным ільном накрыла пуню і цэлы воз добраякаснай трасты схавала ў пуні і зрабіла ў хаце заваліны. Вось такія кулацкія сабатажнікі і зьяўляюцца прычынай невыкананьня пляну ільназагатовак. На 10 лютага выканан плян толькі на 44 проц. Яны ўхітраюцца сабатаваць, калі калгас напружвае ўсе сілы на выкананьне пляну.

Кулацкім сабатажнікам ня месца ў калгасе. Калгас можа і павінен выканаць плян загатовак па ільну.

С.

Шклоўскі р.

Бярэце прыклад з Дуні Стрыгінай

Стрыгіна Дуня з калгасу „Чырвоны сьцяг" абвясьціла сябе ўдарніцай фінфронту. Праца Дуні зьяўляецца лепшым прыкладам таго, як павінна працаваць ударніца фінфронту.

Дуня Стрыгіна правяла агульны сход ў сваім калгасе, вяла сыстэматычную растлумачальную працу сярод калгасьнікаў. Вынік гэтай працы відавочны. Калгас „Чырвоны сьцяг", які налічвае 34 двары застрахаваўся па каляктыўнай страхоўцы на суму 34 тысячы. Усе калгасьнікі ўступілі ўкладчыкамі ў ашчадкасу.

Калгасьнікі ўзялі на буксір суседні калгас „Чырвоная Буда" па выкананьні фінпляну.

Галя.

„Калі мы будзем працаваць сумленна, працаваць на сябе, на свае калгасы—дык мы даб'емся таго, што ў якія небудзь 2—3 гады паднімем усіх калгасьнікаў і быўшых беднякоў і быўшых серадняком да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і вядуць упаўне культурнае жыцьцё.

(З прамовы т. Сталіна на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў).

Аб падрыхтоўцы рабочай скаціны да веснавой сяўбы

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

Посьпех веснавой сяўбы і ў асаблівасьці тэрміны яе правядзеньня будуць залежыць, галоўным чынам, ад стану і належнай падрыхтоўкі да веснавых работ рабочай скаціны і ў першую чаргу каня. Ня гледзячы на неаднаразовыя ўказаньні партыі і ўраду на неабходнасьць рашучага паляпшэньня догляду, выкарыстаньня і зьберажэньня конскага пагалоўя ў калгасах і саўгасах, пералом, што намеціўся ў гэтай справе, усё яшчэ яўна невыстарчальны.

Неахайны, абязьлічаны догляд каня, няправільнае, часамі драпежніцкае выкарыстаньне, дрэнная пастаноўка кармленьня, ставяць пад пагрозу ў радзе калгасаў выкананьне пляну сяўбы і, перш за ўсё тэрміны яе правядзеньня.

У мэтах найбольш дакладнай падрыхтоўкі рабочай жывёлы (коняй, валоў і вярблюдаў) да веснавой пасеўнай кампаніі, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. Не пазьней 20 лютага правесьці пад асабістай адказнасьцю старшыні калгасу і дырэктара саўгасу дакладны агляд усяго конскага складу па калгасах і саўгасах і разьбіць яго на дзьве групы—працаздольных і слабасільных.

Усіх слабасільных коняй неадкладна вызваліць ад якіх-бы там ні было работ і паставіць іх на ўзмоцнены падкорм з тым, каб да пачатку веснавой сяўбы поўнасьцю аднавіць іх працаздольнасьць.

Працаздольных коняй у вытвараючых абласьцях (Паўночны Каўказ, Украіна, Сярэдняя Волга, Ніжняя Волга) паставіць на поўны адпачынак і падкорм за тры дні да пачатку сяўбы.

Усіх жарэбных матак абавязкова вызваліць ад цяжкай работы за два месяцы да жарабленьня і дапускаць да работы не раней чым праз месяц пасьля жарабеньня.

Адказнасьць за правядзеньне гэтага мерапрыемства па кожнай брыгадзе нясе брыгадзір, а па калгасе ў цэлым—старшыня калгасу: кантроль за яго правядзеньнем і ажыцьцяўленьнем усклада́ецца на старшыню сельсавету і сакратара партсельячэйкі.

2. Пад адказнасьцю старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў выдзеліць і забараніяваць ва ўсіх калгасах і саўгасах неабходную колькасьць грубых кармоў (сена, саломы і паловы) лепшай якасьці з разьліку 10—12 кгр. у дзень на кожнага каня, 18—20 кгр. на кожнага вала і ня менш 2-3 цэнт. канцэнтраваных кармоў на кожнага каня на ўвесь пэрыяд пасеўнай кампаніі, выкарыстаўшы для гэтага ў першую чаргу адкіды ад ачысткі і сартаваньня насеньня, млынавыя адкіды і высеўкі.

Выдзеленыя кармы павінны паступіць у распараджэньне брыгадзіра і выдаткоўвацца з такім разьлікам, каб іх хапіла на ўвесь пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

Абавязаць старшынь абласных і краявых выканкомаў неадкладна перакінуць ў калгасы, якія адчуваюць патрэбу ў грубых кармох, неабходную колькасьць гэтых кармоў з раёнаў, маючых лішкі грубых кармоў.

Пад адказнасьцю тых-жа асоб (старшынь калгасаў і дырэктароў саўгаса) наладзіць кармленьне коняй з найлепшым выкарыстаньнем грубых кармоў (абавязковую дробную сечку саломы, запарку сечкі і паловы, мешаніну, сваячасовы вадапой і інш.).

3. Прыняць меры да сапраўднай аховы выдзеленых кармоў. За ўсякае раскрадваньне і разбазарваньне кармавых фондаў у калгасах і саўгасах вінаватых прыцягваць да крымінальнай адказнасьці згодна закону аб ахове грамадзкай уласнасьці.

4. Абавязкова ўвесьці там, дзе гэта яшчэ не арганізавана, штодзённую чыстку коняй, сваячасовую расчыстку капытоў.

Старшыням калгасаў і брыгадзірам наглядаць за тым, каб усе рабочыя коні былі абавязкова сваячасова і правільна падкаваны.

Прапанаваць усім дырэктарам саўгасаў і праўленьням калгасаў не пазьней 1-га сакавіка праверыць увесь склад конюхаў і валоўнікаў з тым, каб на гэту важнейшую работу былі пастаўлены толькі праверaныя і зусім добрасумленныя калгасьнікі і рабочыя саўгасаў; увесь сацыяльна чужы элемэнт неадкладна адхіліць ад догляду каня. Адабраны склад конюхаў павінен быць узмацован, як пастаянны з нагрузкай ня звыш 10 рабочых коняй на канюха.

6. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў выкарыстаньні коняй прымацаваць да кожнай пары коняй калгасьніка, працуючага на іх на працягу ўсяго пэрыяду сельска-гаспадарчых работ і ўскласьці на яго, нобач з конюхам, адказнасьць за захаваньне, беражлівыя адносіны і сваячасовае кармленьне пераданых яму коняй.

7. Уся рабочая скаціна калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС павінна быць поўнасьцю выкарыстана на палявых работах. Ускласьці на дырэктара МТС адказнасьць за рацыянальнае выкарыстаньне і захаванасьць рабочай скаціны калгасаў, якія яны абслугоўваюць, а таксама правільнае разьмеркаваньне палявых работ паміж трактарамі і жывой цягавай сілой.

8. Абавязаць палітаддзелы МТС і саўгасаў у раёнах, якія імі абслугоўваюцца, выдзеліць у якасьці важнейшай задачы сваёй работы, падрыхтоўку коняй да веснавой сяўбы—правільнае іх выкарыстаньне, догляд і ўтрыманьне.

9 Ва ўсіх калгасах і саўгасах у часе веснавой пасеўнай кампаніі ўстанавіць абавязковы штотыднёвы адпачынак рабочых коняй.

Пры ўстанаўленьні норм выпрацоўкі для коняй, разьбіць іх па працаздольнасьці на асобныя групы і ўстанавіць нормы асобна для кожнай групы.

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 10 КАП.

Абавязаць калгасы і саўгасы сваячасова падрыхтаваць і адрамантаваць усю вупраж, і прымацаваць да кожнага каня пастаянна падагнаны да яго камплект.

Адказнасьць за спраўны стан вупражы ўскласьці на конюха і працуючага на даным кані калгасьніка.

10. З прычыны таго, што злучная кампанія саўпадае з часам веснавой сяўбы, у мэтах нармальнага аднаўленьня конскага пагалоўя абавязаць брыгадзіраў і старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў сваячасова пусьціць у злучку усіх матак, годных для расплоду. Кантроль і праверка фактычнага правядзеньня злучнай кампаніі ўскладаецца на партарганізацыю і сельсаветы.

11. Райкомам і РВК арганізаваць вэтэрынарны агляд усёй рабочай скаціны ў пэрыяд падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і ўмацніць вэтэрынарнае абслугоўваньне на ўвесь пэрыяд веснавых палявых работ, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з каростай.

12. Забараніць усякае правядзеньне гужавой павіннасьці да сканчэньня веснавой пасеўнай кампаніі, а таксама катэгарычна забараніць пад адказнасьцю старшынь РВК і старшынь сельсаветаў, выкарыстаньне коняй калгасаў для разьездаў розных упаўнаважаных як мясцовых, так і ўсіх іншых арганізацый, да цэнтральных уключна.

13. Асоб, вінаватых у няправільным, драпежніцкім выкарыстаньні каня (празьмерная чэпасільная перагрузка, зьбіваньне, гонка, няправільнае запраганьне і інш.) прыцягваць да суровай судовай адказнасьці.

Мясцовым органам улады і пракуратуры не пакідаць без расьсьледваньня ні аднаго выпадку падзяжу рабочай скаціны і прыцягваць вінаватых у падзяжы да суровай адказнасьці.

Пракуратуры ўзмацніць нагляд за выкананьнем пастановы ЦВК і СНК СССР аб разьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя ад 27 мая 1932 году.

Катэгарычна забараніць Дзяржстраху выдаваць страхавыя прэміі за падзеж жывёлы ад змораснасьці або драпежніцкай эксплёатацыі.

14. Усіх членаў партыі і камсамольцаў калгасаў і саўгасаў абавязаць быць прыкладам для ўсіх калгасьнікаў і саўгасных рабочых у справе правільна а выкарыстаньня, догляду і бярэжлівых, гаспадарных адносін да рабочай скаціны і ў першую галаву да каня.

Старшыня Саўнаркому Саюзу ССР В. МОЛАТАУ (Скрабін).

10 лютага, 1933 году.

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

Пільнае вока дэлегаткі павінна быць у стайні

Пастанова партыі і ўраду аб падрыхтоўцы рабочай скаціны да веснавой сяўбы, зьяўляецца шырокай праграмай практычных дзеяньняў для кожнага калгасу і саўгасу Гэта праграма абавязкова павінна быць ажыцьцёўлена.

Кожны саўгасны і калгасны дэлегацкі сход, агульныя сходы жанчын у калгасах і саўгасах прапрацаваўшы гэту пастанову, павінны прыняць актыўны ўдзел ў яе ажыцьцяўленьні.

Брыгады дэлегатак трэба прымацаваць да стайні на ўвесь час падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы. Пільнае вока дэлегаткі павінна быць заўсёды ў стайні, каб сваячасова сыгналізаваць кіраўніцтву калгасаў аб зрывах правільнага догляду каня. Ставіць гэта пытаньне на абгаварэньне праўленьня і агульнага сходу калгасьчыкаў. Праздрук (насьценную газэту, сваю раённую і часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“) асьвятляць пытаньне падрыхтоўкі каня да веснавой сяўбы. Дзяліцца добрым вопытам працы ў гэтай галіне.

Рэдакцыя.

Чыстка скотнага двара ў саўгасе імя 1-га мая (Лівеньскі р-н Ц. Ч.В.).

Калгас 1 мая ўвёў травасеяньне вікі вусом для загатоўкі сільных кармоў. Зап. абласьць.

304

Выданьне ЦК КП(б)Б. Адк. рэдактар Э. ШАПІРА

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 676. У ліку 10.000 экз. Літ. № 1416.